# РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ Ў КАНЦЫ XX – ПАЧАТКУ XXI ст.

1. Грамадска-палітычнае жыццё Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе (1991–2017 гг.).
2. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў сучасных умовах.
3. Рэспубліка Беларусь у міжнароднай супольнасці

Працэс станаўлення суверэннай беларускай дзяржавы быў немагчымы без фарміравання ўласных органаў кіравання, інстытутаў і атрыбутаў незалежнай дзяржавы. Вялікія змены адбыліся ў сістэме органаў дзяржаўнай улады і кіравання. Рэспубліканскія міністэрствы, ведамствы, камітэты, што раней знаходзіліся ў саюзным падпарадкаванні, пераўтвараліся ў дзяржаўныя органы Рэспублікі Беларусь. Важнай праявай суверэнітэту беларускай дзяржавы стала **фарміраванне ўласнай грашовай сістэмы**. У абарачэнне былі ўведзены **разліковыя білеты Нацыянальнага банка** Беларусі.

На працягу ***1992 – 1994 гг.*** Вярхоўны Савет стаў арэнай жорсткай палітычнай барацьбы па пытаннях эканамічнага жыцця, вызначэння палітычнага ладу дзяржавы, будучага дагавору з Расіяй

***15 сакавіка 1994 г.*** Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў новую **Канстытуцыю**. Канстытуцыяй уведзена прэзідэнцкая форма кіравання. ***10 ліпеня 1994 г.*** першым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь быў выбраны **А.Р. Лукашэнка**.

***14 мая 1995 г.*** былі праведзены **парламенцкія выбары** і **рэспубліканскі рэферэндум**, на якім беларускі народ падтрымаў прапановы кіраўніка дзяржавы аб наданні рускай мове роўнага статусу з беларускай, развіцці эканамічнай інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй, устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, аб унясенні змяненняў у Канстытуцыю РБ, якія прадугледжвалі магчымасць датэрміновага спынення паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Прэзідэнтам РБ у выпадках сістэматычнага або грубага парушэння парламентам Канстытуцыі

***19 – 20 кастрычніка 1996 г.* у Мінску адбыўся Усебеларускі народны сход**, дзе з дакладам “**Толькі народ мае права рашаць свой лёс**” выступіў **А.Р. Лукашэнка**. Дэлегаты схода ўхвалілі ўнутраную і знешнюю палітыку, што праводзіла кіраўніцтва дзяржавы. ***24 лістапада 1996 г.*** адбыўся **2-гі рэспубліканскі рэферэндум**, на якім беларускі народ прагаласаваў за прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь са змяненнямі і дапаўненнямі, прапанаванымі **А.Р. Лукашэнкам**, выказаўся супраць свабоднай куплі і продажу зямлі, супраць адмены смяротнай кары ў Рэспубліцы Беларусь, за перанясенне Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь з ***27 ліпеня*** на ***3 ліпеня***

Замест аднапалатнага **Вярхоўнага Савета** быў сфарміраваны 2-хпалатны **Нацыянальны сход**. Ён складаецца з **Палаты прадстаўнікоў** і **Савета Рэспублікі**. Прэзідэнт з’яўляецца кіраўніком дзяржавы, гарантам Канстытуцыі, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна. Кіраўніком выканаўчай улады з’яўляецца прэм’ер-міністр урада, пашыраны правы і паўнамоцтвы **Савета Міністраў.**

***11 лютага 2000 г.*** у РБ быў прыняты **новы Выбарчы кодэкс**, у адпаведнасці з якім адбыліся парламенцкія выбары ***2000 г.***

***18 мая 2001 г.* у Мінску адбыўся 2-гі Усебеларускі народны сход*.*** На ім з дакладам **“За моцную, квітнеючую Беларусь”** выступіў **А.Р. Лукашэнка**. Сход падвёў вынікі выканання **“Асноўных напрамкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 1996 – 2000 гг”*.*** Была абмеркавана і ўхвалена Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на ***2001 – 2005 гг.***

***9 верасня 2001 г.*** Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на новы 5-гадовы тэрмін выбраны **А. Р. Лукашэнка**.

У ***2002 г.*** былі зацверджаны музыка і словы Гімна Рэспублікі Беларусь. Аўтарам музыкі з’яўляецца кампазітар **Н. Сакалоўскі**, аўтарамі слоў – паэты **М. Клімковіч** і **У. Карызна**

***17 кастрычніка 2004 г.*** адбыўся ініцыіраваны Прэзідэнтам **рэспубліканскі рэферэндум** і **выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў** Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. На **3-м рэспубліканскім рэферэндуме** пераважная большасць беларусаў прагаласавала за тое, каб унесці ў артыкул 81 Канстытуцыі РБ змены, сутнасць якіх зводзілася да адмены забароны адной і той жа асобе займаць пасаду Прэзідэнта больш за 2 разы.

***2 – 3 сакавіка 2006 г.*** **у Мінску адбыўся 3-ці Усебеларускі народны сход**, на якім з дакладам **"Дзяржава для народа"** выступіў **А. Р. Лукашэнка**. Сход падвёў вынікі папярэдняга перыяду і зацвердзіў Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на ***2006 – 2010 гг.*** На чарговых прэзідэнцкіх выбарах ***19 сакавіка 2006 г.*** кіраўніком дзяржавы быў зноў абраны **А.Р. Лукашэнка**

***6 – 7 снежня 2010 г.*** у Мінску адбыўся **4-ты Усебеларускі народны сход**, які падвёў вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў ***2006 – 2010 гг.*** і зацвердзіў **Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2011 – 2015 гг.**

Новыя прэзідэнцкія выбары адбыліся ***19 снежня 2010 г.*** Перамогу на іх атрымаў **А.Р. Лукашэнка.**

***11 кастрычніка 2015 г.*** адбыліся чарговыя прэзідэнцкія выбары. Перамогу на іх атрымаў **А.Р. Лукашэнка.**

***22 – 23 чэрвеня 2016 г.*** у Мінску адбыўся **5-ты Усебеларускі народны сход**, на якім адбылося абмеркаванне вынікаў рэалізацыі **Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця** Беларусі ў мінулай пяцігодцы, а таксама планаў развіцця краіны на ***2016 – 2020 гг.***

У ***1991 г.***, на 2 гады пазней, чым у СССР у цэлым, пачаўся спад у эканоміцы Беларусі і эканамічны крызіс, які працягваўся да ***1995 г.*** уключна.

Для пераадольвання крызісных з’яў і недахопаў, а таксама для вызначэння перспектыўных задач у правядзенні рынačных рэформ былі распрацаваны **“Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь *на 1996 - 2000 гады*”**. ***20 кастрычніка 1996 г.*** **удзельнікі I Усебеларускага народнага сходу ўхвалілі гэты дакумент.** **Мэтай** новай праграмы стала **пабудова сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі**, дасягненне ў ***2000 г.*** узроўню ***1990 г.*** па важнейшых эканамічных паказчыках

У ***2001 г*** пачаўся новы этап трансфармацыі эканомікі Беларусі. **У перадвыбарнай праграме “За моцную, квітнеючую Беларусь!” А. Лукашэнка** заявіў аб лібералізацыі эканомікі, стымуляванні прадпрымальніцкай актыўнасці, спрашчэнні працэсу рэгістрацыі прадпрымальніцкіх структур, скарачэнні колькасці ліцэнзійных відаў дзейнасці і г.д.

**Кіраўніцтвам была распрацавана і прынята на 2-м Усебеларускім народным сходзе *(18 мая 2001 г.)* “Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця РБ *на 2001 – 2005 гг.*”**. Праграма прадугледжвала стварэнне высокаэфектыўнай сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі з дзейсным механізмам дзяржаўнага і рыначнага рэгулявання

На **3-м Усебеларускім народным сходзе** ў ***сакавіку 2006 г.*** былі агучаны вынікі 3-яй пяцігодкі (***2000 – 2005 гг.***). Большасць планаў былі не толькі выкананы, але і значна перавыкананы. На сходзе была зацверджана **“Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця РБ *на 2006 – 2010 гг.*”**

У ажыццяўленні гэтай праграмы кіраўніцтву краіны давялося сустрэцца са значнымі перашкодамі (нафта-газавы канфлікт з Расіяй у ***пачатку 2007 г.***, “малочная вайна” ***пачатку 2009*** г. і г.д.). Адмоўна сказваліся на эканоміцы рэспублікі і наступствы сусветнага эканамічнага крызісу ***2008 г***. Вынікі мінулай пяцігодкі былі падведзены ***6 – 7 снежня 2010 г.*** у Мінску на **4-м Усебеларускім народным сходзе**, які таксама зацвердзіў **Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны** на ***2011 – 2015 гг.***

Беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця мае свае **асаблівасці**:

**1. пабудова і развіццё моцнай і эфектыўнай дзяржавы.**

**2. забеспячэнне раўнапраўя ўсіх форм уласнасці, усіх форм гаспадарання.**

**3. ажыццяўленне індывідуальнай, прадуманай прыватызацыі, якая павінна быць накіравана на павышэнне эфектыўнасці вытворчасці.**

**4. разгортванне шырокіх інтэграцыйных працэсаў з краінамі СНД, перш за ўсё з Расіяй.**

**5. шматвектарнасць эканамічных сувязей.**

**6. правядзенне моцнай сацыяльнай палітыкі дзяржавы.**

**Беларуская мадэль** атрымала назву **сацыяльна арыентаванай шматукладнай рыначнай эканомікі**

***2011 г.*** прынёс новыя выпрабаванні для эканомікі Беларусі. Кіруючыя колы прадпрынялі сробы выхаду са склаўшайся сітуацыі. У ***пачатку лістапада 2011 г.*** Міністэрствам эканомікі і іншымі ўдзельнікамі ўрада быў распрацаваны шэраг прапаноў па змяненні курса сацыяльна-эканамічнага развіцця на ***2012 г.*** План быў раскрытыкаваны кіраўніком дзяржавы. **22 лістапада 2011 г.** ***А. Лукашэнка*** даў даручэнне распрацаваць новы план сацыяльна-эканамічнага развіцця.

***2012*** – ***2013 г.*** далі падставы разлічваць на выхад са складанай сацыяльна-эканамічнай сітуацыі. Аднак санкцыі супраць Расіі рыкашэтам ударылі і па нашай эканоміцы ў ***2014 – 2015 гг.***

Вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў ***2011 – 2015 гг.*** былі падведзены на ***V Усебеларускім народным сходзе 22 – 23 чэрвеня 2016 г.*** Яны паказалі, што краіна дасягнула бясспрэчных поспехаў у галіне сацыяльнай палітыкі. У мінулай пяцігодцы была праведзена мадэрнізацыя базавых галін эканомікі, зроблены зачын для развіцця прынцыпова новых кірункаў – атамнай энергетыкі, касмічнай, біятэхналагічнай і іншых галін. Аб'ём замежных інвестыцый у эканоміку Беларусі вырас у 2,5 разы.

На сходзе быў прадстаўлены праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на ***2016 – 2020 гг.*** Ім намечаны прырост ВУП, вытворчасці працы і інвестыцый на 12 – 15 %, экспарту – на 21 – 25%, рэальных грашовых прыбыткаў грамадзян – на 9,5 – 11,6%

# Характарыстыка месца Рэспублікі Беларусь ў міжнароднай супольнасці

1. Рэспубліка Беларусь з’яўляецца ўнітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай, якая валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі.

2. Рэспубліка Беларусь – невялікая суверэнная дзяржава ў цэнтры Еўропы. Яна ніколі не прэтэндавала і не прэтэндуе сёння на выключна важную ролю ў міжнародных справах. Рэспубліка Беларусь уносіць свой пасільны ўклад у вырашэнне такіх міжнародных праблем, як мір і бяспека дзяржаў і народаў, барацьба з гандлем людзьмі і чалавечымі органамі, пераадоленне вытворчасці і распаўсюджвання наркатычных сродкаў, недапушчэнне незаконнай міграцыі насельніцтва, барацьба з міжнародным тэрарызмам і г.д.

3. Рэспубліка Беларусь – бяз’ядзерная дзяржава.

4. Рэспубліка Беларусь – удзельнік усіх міжнародных арганізацый, створаных на постсавецкай прасторы. Сярод гэтых арганізацый – СНД, Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі, Еўразійскі эканамічны саюз, Арганізацыя дагавора калектыўнай бяспекі.

5. Рэспубліка Беларусь не мае тэрытарыяльных прэтэнзій да сваіх суседзяў.

6. Рэспубліка Беларусь развівае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, а таксама супрацоўніцтва ў галіне адукацыі, навукі, літаратуры і мастацтва з усімі краінамі свету на аснове поўнага раўнапраўя, узаемнай павагі і неўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы без усялякіх папярэдніх умоў і патрабаванняў, квот, санкцый і забарон